■ Віншуем!

# ПУЦЁЎКУ Ў ЖЫЦЦЁ ДАЛА «ЗВЯЗДА»

**У Магілёве адкрылася фотавыстава легенды айчыннай рэпартажнай фатаграфіі Мікалая ЖАЛУДОВІЧА, прысвечаная яго 90-годдзю. На чорна-белых здымках жывая гісторыя Магілёўшчыны, дух савецкай эпохі. Чвэрць стагоддзя майстар працаваў фотакарэспандэнтам БЕЛТА па Магілёўскай вобласці. Але яго творчая кар'ера пачалася менавіта са «Звязды» — у сярэдзіне 50-х, калі ён яшчэ быў інжынерам па ўкараненні новай тэхнікі на магілёўскім заводзе «Строммашына».**



З калегамі па фотасправе (ЖАЛУДОВІЧ крайні справа).



Фатаграфіяй Мікалай Жалудовіч захапіўся яшчэ ў арміі, калі служыў на Чукотцы. А калі вярнуўся дадому, фіксаваў будні і святы роднага горада, працоўныя моманты свайго прадпрыемства. Калі фотакарэспандэнт «Звязды» Уладзімір Кітас пабываў на заводзе і ўбачыў яго выстаўку, адразу ж распазнаў талент: Мікалай Жалудовіч стаў пазаштатным фотакарэспандэнтам «Звязды». Хутка яго заўважылі і іншыя выданні.

Героямі фотарэпартажаў майстра станавіліся і звычайныя рабочыя людзі, і знакамітасці — тройчы Герой Савецкага Саюза Іван Кажадуб, дыктар Усесаюзнага радыё Юрый Левітан, палітычныя дзеячы Аляксей Касыгін, Пётр Машэраў, музыканты і спевакі сусветнага маштабу... Толькі ў асабістым фондзе майстра налічваецца больш за 10 тысяч негатываў.

Павіншаваць юбіляра прыйшлі прадстаўнікі кіраўніцтва вобласці, калегі, сябры, студэнты МДУ імя Куляшова, прыхільнікі яго творчасці.

**«Звязда» далучаецца да шматлікіх віншаванняў і жадае майстру моцнага здароўя і творчага настрою.**

**Нэллі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.15 | 18.41 | 11.26 |
| Віцебск — | 7.06 | 18.29 | 11.23 |
| Магілёў — | 7.05 | 18.31 | 11.26 |
| Гомель — | 7.01 | 18.28 | 11.27 |
| Гродна — | 7.30 | 18.56 | 11.26 |
| Брэст — | 7.30 | 18.58 | 11.28 |

## Месяц

*Поўня 5 кастрычніка. Месяц у сузор'і Рыб.*

## Імяніны

*Пр. Алега, Аляксандра, Міхаіла, Фёдара.*
*К. Тэрэзы, Юзафа, Яна.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




■ Слухай сваё

## РАДЫЁ «БЕЛАРУСЬ» — ЦЯПЕР І НА АРАБСКАЙ МОВЕ!

**Адкрыўся новы вяшчальны сезон. Праграмы міжнароднага вяшчання Беларускага радыё, якія цяпер можна слухаць на беларускай, рускай, англійскай, нямецкай, польскай, французскай, іспанскай і кітайскай мовах, папоўняцца і арабскай перадачай. Штотыдзень у эфіры на гэтай мове будзе гучаць адмысловы праект «Знаёмцеся, Беларусь!». Пра гэта расказалі ў прэс-службе Белтэлерадыёкампаніі.**

— Наша краіна актыўна развівае супрацоўніцтва з дзяржавамі арабскага свету. Сферы — самыя розныя: ад палітыкі і эканомікі да сацыяльных і культурных пытанняў. І гэта, безумоўна, адбіваецца на эфіры радыё «Беларусь». На 345 мільёнаў слухачоў прырасце наша патэнцыйная аўдыторыя. Між іншым, у падрыхтоўцы перадач актыўны ўдзел будуць прымаць носьбіты арабскай мовы, — зазначыў **галоўны дырэктар міжнароднага радыё «Беларусь» Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ.**

Больш стане перадач, якія будуць гучаць па-кітайску. Радыёжурналісты змогуць шырэй асвятляць шматлікія стасункі Беларусі і Паднябеснай, распавядаць і пра тое, як кітайскія студэнты і спецыялісты жывуць у нашай краіне. Праграму "Ваш сябар — Беларусь" разам з нашымі рэдактарамі будуць рыхтаваць выкладчыкі і выпускнікі Інстытута журналістыкі БДУ.

Павялічыцца і колькасць перадач на французскай і іспанскай мовах. Гэта абумоўлена тым, што у слухачоў, якія валодаюць гэтымі мовамі, даволі вялікая цікавасць да Беларусі. Істотную частку такіх перадач радыё «Беларусь» прысвеціць супрацоўніцтву з дзяржавамі Паўднёвай Амерыкі.

Сучаснае замежнае радыё немагчыма ўявіць без інтэрактыву са слухачамі. Месяц таму на радыё «Беларусь» распачалася патрыятычная акцыя «Гукае ласкай родны край». Слухачы з розных краін свету, якія маюць беларускія карані, могуць перадаць анлайн-прывітанне сваёй малой радзіме. Ім можа стаць здымак з краіны, дзе чалавек жыве цяпер, ці фота з сямейнага архіва, з роднымі і сябрамі. Да матэрыялаў можна прымацаваць невялікі ліст і адправіць допіс на электронную паштовую скрыню hellobelarus@gmail.com.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *Schklennik_1992@zviazda.by*

Даты | Падзеі | Людзі

## 3 КАСТРЫЧНІКА



**1895** год — дата нараджэння Сяргея Ясеніна, выдатнага рускага паэта. З першых паэтычных зборнікаў выступаў як тонкі лірык. Аўтар драматычных паэм, аповесцяў, нарысаў, літаратурна-крытычных артыкулаў. Творчасць Ясеніна аказала ўплыў на многіх паэтаў свету, у тым ліку і на беларускіх (на яго творчасць арыентаваліся, напрыклад, А. Вялюгін, А. Куляшоў, П. Трус і інш.).

**1897** год — нарадзіўся Луі Арагон (1897—1982), французскі пісьменнік, грамадскі дзеяч, удзельнік руху Супраціўлення, лаўрэат Міжнароднай прэміі міру (1957). Аўтар рамана «Камуністы», паэмы «Няскончаны раман» і іншых твораў.

**1906** год — у Берліне адбылася Марская канферэнцыя з удзелам прадстаўнікоў 29 дзяржаў, дзе быў зацверджаны новы міжнародны сігнал бедства на моры, які пазней стаў шырока вядомы як сігнал «SOS». Першапачаткова прапанаваны сігнал складаўся з літар CQD: першыя дзве літары азначалі стандартны выклік усіх радыёстанцый, а апошняя — D — была дададзена да сігналу таму, што з гэтай літары пачыналася англійскае слова Danger — небяспека. Да гэтага спалучэння маракі хутка падабралі фразу «Come Quick, Danger», што азначае з англійскай «Ідзіце хутка, небяспека». Аднак у выглядзе кода на мове азбукі Морзэ гэтая фраза мела даволі складаны выгляд. Каб пазбегнуць непрыемнасцяў, замест гэтых літар вырашана было выбраць іншы сігнал — ён уяўляе сабой паслядоўнасць «тры кропкі—тры працяжнікі—тры кропкі», перадаваемую без якіх-небудзь інтэрвалаў. Такім чынам, гэты сігнал быў абраны з чыста тэхнічных меркаванняў. Фразы, якія часта з ім звязваюць (як расшыфроўку «SOS»), — «Save Our Ship» («выратуйце наш карабель»), або «Save Our Souls», «Save Our Spirits» («выратуйце нашы душы»), або «Swim Or Sink» («плывіце або патонеце»).

**1937** год — нарадзіўся (г. Сянно) Яўген Рыгоравіч Радкевіч, беларускі пісьменнік, кандыдат гістарычных навук, доктар філалагічных навук, прафесар. Працаваў на Беларускім радыё, у газеце «Мінская праўда», з 1974 года — у Белдзяржуніверсітэце. Аўтар раманаў «Суткі дзён», «Закон прыцяжэння», зборнікаў апавяданняў і аповесцяў. Даследаваў гісторыю і развіццё беларускага радыё, тэлебачання. Памёр у 1999 годзе.

**1938** год — нарадзіўся (г. Віцебск) Ігар Пятровіч Крук, беларускі тэхнолаг сродкаў вылічальнай тэхнікі, адзін з распрацоўшчыкаў тэхналогіі вытворчасці вырабаў вылічальнай тэхнікі наменклатуры Адзінай сістэмы ЭВМ, вылічальных комплексаў спецыяльнага прызначэння, сродкаў аўтаматызацыі тэхналагічных працэсаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

Было сказана

**Альберт ЭЙНШТЭЙН, фізік:**
*«Я ніколі не думаю аб будучым — яно наступае вельмі хутка».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Разбіраў у шафе шкарпэткі і прыйшоў да высновы, што 50 штук шкарпэтак — гэта, на жаль, не 25 пар, а гэта 50 шкарпэтак...**

— Алё, добры дзень, Маша! Вы ў рэзюмэ выказалі гарантыю, што ў нашым рыэлтарскім агенцтве, калі мы вас возьмем на работу, справы рэзка пойдуць угару. Якімі прафесійнымі навыкамі вы валодаеце?

— 30 гадоў, рост 178, 90-60-90.

— Ну... А вопыт продажу маецца?

— Вядома! Пяты раз замужам!

**Любы інтэлігент можа каго хочаш навучыць ляцца, калі ў яго зрываецца кілаграмовая фарэль.**

— Роза на цікавую дыету села, не есць пасля шасці гадзін.

— І як, яна вытрымлівае?

— Звычайна гадзін да сямі.


caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3662.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 2 кастрычніка 2017 года.